2. Растлумачце, якім чынам палачане ў старажытнасці маглі трапіць да Чорнага мора. Скарыстайцеся картасхемай на с. 16 вучэбнага дапаможніка.
3. Разгледзьце малюнак на с. 74 вучэбнага дапаможніка. Раскажыце адно з паданняў пра паходжанне назвы нашай сталіцы.
4. Падлічыце, карыстаючыся самастойна складзенай «стужкай часу», колькі гадоў гораду Мінску.

Даведайцеся аб часе ўзнікнення і паходжанні назвы вашага населенага пункта. Падрыхтуйце вуснае паведамленне.

## 20. ПАЧЫНАЛЬНІК КНІГАДРУКАВАННЯ

Мінула шмат стагоддзяў, пакуль у Беларусі з’явілася першая друкаваная кніга. Пачынальнікам кнігадрукавання сярод усходніх славян стаў **Францыск Скары́на**.

Нарадзіўся Скарына ў канцы 15 стагоддзя ў Полацку. Пачатковую адукацыю атрымаў у сваім родным горадзе. Потым вучыўся ў польскім горадзе Кракаве ва ўніверсітэце. Тут атрымаў першую сваю вучоную ступень бакалаўра. Неўзабаве Францыск паспяхова здаў

 Правообладатель Издательский центр БГУ




Тытульны ліст Бібліі, выдадзенай Скарынам у Празе

экзамен на званне доктара медыцыны. Гэта адбылося ў Падуанскім універсітэце — адным з найстарэйшых універсітэтаў Італіі. Медыцынай у далейшым займаўся і сын Скарыны.

Стаўшы выдатным вучоным, Скарына вырашыў узяцца за друкаванне кніг на старабеларускай мове. На радзіме ўмоў для друкавання не было, і ён накіраваўся ў чэшскі горад Прагу. Тут у **1517 годзе** выйшла ў свет першая друкаваная кніга, выдадзеная Скарынам. Пазней ён перавёз сваю друкарню ў Вільню, дзе працягнуў любімую справу.

Правообладатель Издательский центр БГУ



Партрэт Францыска Скарыны і загалоўныя літары з выдадзеных ім кніг

У афармленні кніг Скарына шырока выкарыстоўваў ілюстрацыі. Асобныя літары алфавіта, з якіх пачынаўся тэкст, ён упрыгожваў пэўным малюнкам, каб лягчэй запаміналася. Каля «К» — казлянятка, каля «З» — звер, каля «Л» — лён. А да літары «Я» першадрукар намаляваў свой партрэт.

Скарыну часта даводзілася пераязджаць з краіны ў краіну, з горада ў горад. Ён ніколі


Правообладатель Издательский центр БГУ

не забываўся пра сваю Радзіму. У адной з кніг ён пісаў: «Звяры, якія жывуць у пустыні, ад нараджэння ведаюць норы свае; птушкі, якія лятаюць у паветры, ведаюць гнёзды свае; рыбы, якія плаваюць у морах і рэках, чуюць віры свае; пчолы і ім падобныя бароняць вуллі свае; так і людзі да таго месца, дзе нарадзіліся і выраслі, вялікую ласку маюць».



Ордэн Францыска Скарыны

Прыкладам уласнага жыцця Францыск Скарына паказаў, як трэба любіць свой народ і шанаваць матчыну мову. На радзіме Скарыны ў Полацку ўзведзены помнік беларускаму першадрукару. Помнік яму вы можаце ўбачыць у нашай сталіцы каля Нацыянальнай бібліятэкі. Скульптура першадрукара ўстаноўлена ў дворыку Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Акрамя таго, помнік Скарыну ёсць у горадзе Лідзе. Самыя славутыя людзі нашай краіны і замежжа ўзнагароджваюцца ордэнам Францыска Скарыны. Так у Рэспубліцы Беларусь шануецца памяць аб славутым земляку.

А Разгледзьце карту «Славутыя людзі зямлі беларускай» на с. 14—15 атласа. Пакажыце на ёй партрэт Францыска Скарыны, помнік яму і горад, дзе нарадзіўся першадрукар.

Правообладатель Издательский центр БГУ

## Карысна ведаць




Сымон Будны

Прадаўжальнікам справы Скарыны на тэрыторыі Беларусі стаў вядомы беларускі друкар і вучоны **Сымон Будны.** Як і Скарына, ён быў вельмі адукаваным чалавекам, валодаў многімі мовамі. У 1562 годзе Сымон Будны выдаў сваю першую кнігу аб хрысціянскай веры. Яна была надрукавана ў Нясвіжы. Сымон Будны лічыў, што ўсе людзі, багатыя і бедныя, павінны быць роўнымі перад законам. Жыць, сцвярджаў ён, трэба ў міры, але калі неабходна, то бараніць сваю Радзіму. Сёння ў Нясвіжы побач з былой друкарняй стаіць помнік Сымону Буднаму. Друкар годна трымае ў адной руцэ кнігу, нібы запрашае яе пачытаць.

Разгледзьце карту «Славутыя людзі зямлі беларускай» на с. 14—15 атласа. Пакажыце на ёй партрэт Сымона Буднага, помнік яму і горад, дзе ён устаноўлены.

1. Складзіце план паведамлення аб жыцці і дзейнасці Францыска Скарыны.
2. Якімі словамі Скарына выказаў любоў да Радзімы?
3. Раскажыце пра погляды Сымона Буднага.


Правообладатель Издательский центр БГУ